Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І. Слабодчыкава ”

Урок матэматыкі 3 клас

(па праграме спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы для вучняў цяжкасцямі ў навучанні)

# Тэма: Адзінкі вымярэння часу: гадзіна, мінута

Настаўнік-дэфектолаг
Н.А.Цімашчук

**Урок матэматыкі 3 клас**

**(па праграме спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні))**

**Тэма:** Адзінкі вымярэння часу: гадзіна, мінута

**Задачы:** пазнаёміць з адзінкамі вымярэння часу – гадзінай, мінутай; вучыць пераўтвараць адзінкі вымярэння часу з дробных у больш буйныя; удасканальваць вусныя і пісьмовыя вылічальныя навыкі;

Развіваць лагічнае мысленне (уменне аналізаваць, параўноўваць, абагульняць);

Выхоўваць маральныя якасці асобы: адказнасць, працавітасць, стараннасць.

**Абсталяванне:** выстава гадзіннікаў, мадэль гадзінніка, падручнік па матэматыцы

**Ход урока**

**I.** Арганізацыйны момант
Сядзь, калі ласка добра, заплюшчы вочкі і паўтарай за мной.
Я ў школе на ўроку.
Зараз я пачну вучыцца.
Я радуюся гэтаму.
Я ўсё добра запамінаю.
Я гатова працаваць.
Я пачынаю працаваць.

**II.** Увядзенне ў новы матэрыял. Вуснае лічэнне. Падвядзенне да тэмы ўрока.

| **Настаўнік** | **Вучні** |
|---|---|
| *На дошцы запіс*<br>*1 30 =90*<br>*1 10 =70*<br>*1 =60* | *Здзіўляюцца* |
| - Бачу, што ты здзівілася. Чаму? | - Запісаныя няправільныя роўнасці. |
| - Значыць, надякім пытаннем мы будзем думаць на ўроку? | - Чамупастаўлены знак роўнасці, але правая частка выразу не роўная левай. |
| - Якія ёсць ідэі? Як можна не змяняючы знака(=) і лічбаў | - Трэба штосьці дапісаць! |

| | |
|---|---|
| атрымаць правільныя роўнасці? | |
| Як ты думаеш, што будзем дапісваць? Чаму сёння для ўрока падрыхтавана многа розных гадзіннікаў? Што мы вымяраем з дапамогай гадзінніка? А ты ўмееш карыстацца гадзіннікам? | |
| Як ты думаеш чаму мы будзем вучыцца сёння на ўроку? Ці зможам мы ў канцы ўрока адказаць на пытанне : - Чаму пастаўлены знак роўнасці, калі правая частка выразу не роўная левай. | |

- Ты, напэўна здагадалася, што мы сёння на ўроку будзем даследаваць, вывучаць. Але для большай ўпэўненасці пры вызначэнні тэмы ўрока выканаем заданне. Пры правільным выкананні заданняў ты зможаш самастойна даведацца тэму нашага ўрока.

1. Выпішы двухзначныя лікі ў парадку ўзрастання
   34, 2, 17, 11, 6, 20, 7, 30, 44, 15
   (11, 15, 17, 20, 30, 34, 44)
   А зараз параўнай свае адказы з карткай.

| **11** | **15** | **17** | **20** | **30** | **34** | **44** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | **Д** | **З** | **І** | **Н** | **К** | **І** |

2. Рашы прыклады

   80 + 10
   13 – 10

20 + 30

20 + 10

45 – 5

10 + 5

30 + 30

40 + 30

90 - 40

Выпішы адказы па парадку і параўнай з прапанаванай карткай.

| 90 | 10 | 50 | 30 | 40 | 15 | 60 | 70 | 50 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **В** | **Ы** | **М** | **Я** | **Р** | **Э** | **Н** | **Н** | **Я** |

3. Адкажы на пытанні. Адказы запішы.
   Колькі ў годзе месяцаў?(12)
   Колькі тыдняў у месяцы? (4)
   Колькі дзён у тыдні? (7)
   Колькі дзён у верасні?(30)
   (Пры неабходнасці можна карыстацца каляндаром)

   Параўнай адказы з прапанаванай карткай.

| 12 | 4 | 7 | 30 |
|---|---|---|---|
| **Ч** | **А** | **С** | **У** |

4. Перавядзі адзінкі вямярэння часу ў больш дробныя

2 дм 5 см = …

5 дм 9см = …

4 дм 8 см = …

3 дм = …

2 дм 1 см = …

3 дм 5 см = …

Параўнай адказы з прапанаванай карткай.
(25, 59, 48, 30, 21, 35 )

| 25 | 59 | 48 | 30 | 21 | 25 |
|---|---|---|---|---|---|
| **Г** | **А** | **ДЗ** | **І** | **Н** | **А** |

5. Устаў суседзяў лікаў

… 20 …
… 40 …
… 70 …

Адказы запішы па парадку і параўнай з прапанаванай карткай.

| 19 | 21 | 39 | 41 | 69 | 71 |
|---|---|---|---|---|---|
| **М** | **І** | **Н** | **У** | **Т** | **А** |

Зараз усе атрыманыя словы размесцім на дошцы і атрымаем тэму нашага ўрока

АДЗІНКІ ВЫМЯРЭННЯ ЧАСУ: гадзіна, мінута

- Сёння мы з табою пазнаёмімся з адзінкамі вымярэння часу такімі як гадзіна, мінута. Мы з табою павінны пазнаёміцца з гадзіннікамі і вучыцца вызначаць час на цыферблаце гадзінніка. Для гэтага табе трэба ўважліва слухаць і запамінаць.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

- У кожным доме, канешне, ёсцьгадзіннікі. І, напэўна, іхнекалькі. Будзільнік, які дапамагае не праспаць у школу, у некаторых дамах ёсць насценныягадзіннікі з маятнікам і боем, зручныя электронныя і наручныя гадзіннікі. На кухні часам можна ўбачыць і пясочныя часы.

Разглядванне калекцыі гадзіннікаў.

**IV. Фізкультхвілінка**
А зараз давай адпачнём і патанцуем
Музыка з кінафільма "Сказка о потеренном времени"

1. "Часікі" – павароты вочкамі ўлева – управа без павароту галавы.
2. "Маятнік" – нахілы тулава ўлева і ўправа, а затым уперад і назад.
3. "Калёсікі" – кругавыя рухі сагнутымі ў лакцях і прыстаўленымі да плячэй рукамі.
4. "Будзільнік" – хлапкі над галавой.
5. "Пружынкі" – прысяданні.
6. "Часы ідуць, ідуць, а з месца не сыйдуць…" – хадзьба на месце.

**V. Работа з падручнікам:** № 1, 2, с. 34 – 35.

VI. **Работа з мадэллю гадзінніка па падручніку:** № 3, 4; с. 35.

VII. **Падвядзенне вынікаў .**

Зараз давай вернемся да запісу на дошцы і паспрабуем яго выправіць.

VIII. **Дамашняе заданне**

№ 5, с. 35 Рашыць прыклады

IX. **Рэфлексія**

**Тэст**

Выбраць правільныя адказы, саставіць літары, прачытаць слова.

1. Самая дробнай адзінка часу:
   а) гадзіна  с) секунда м) век е) год

2. Якое сцвержанне праўдзівае
   б) у адной гадзіне – 60 секунд  у) 1 гадзіна = 60 мінут  т) год – гэта 30 месяцаў

3. Знайдзі памылку:
   с) 1 гадз – 60 мін.  п) 1 гадз = 70 мін.  о) 1 месяц = 30 дзён

4. У якім радзе адзінкі вымярэння часу размешчаны ў парадку ўбывання
   е) год, месяц, тыдзень;  д) мінута, гадзіна, суткі;  і) суткі, год, мінута

5. Якое сцверджанне правільнае
   в) 1 год = 24 месяцы  д) 1 гадз = 100 мін.  р) 1 гадз = 60 мін.

Якое слова атрымалася? (СУПЕР)

Сёння на ўроку ты была малайчына. Супер